Падтрымай "Вясну" на PATREON

Татальная “зачыстка” Гомеля: судзяць журналістаў, праваабаронцаў, актывістаў дапоўнена

17.03.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Суд Цэнтральнага раёна Гомеля.17 сакавіка 2017 года.

У судзе Цэнтральнага раёна Гомеля сёння будуць разглядацца адміністрацыйныя справы за ўдзел у Маршы недармаедаў 19 лютага ў абласным цэнтры.

Судзяць праваабаронцаў **Леаніда Судаленкі** і **Анатоля Паплаўнага,** намесніка старшыні абласной філіі АГП **Васіля Палякова**, актывіста АГП **Мікалая Пяшко**, **Андрэя Макарава**, блогера **Зміцера Сабурава**, акывіста прафсаюза РЭП **Андрэя Стрыжака, Уладзімера Кацоры, Юрыя Глушакова, Барыса Анікеева.**

Усе суды пачнуцца ў другой палове дня, пасля 15 гадзін.





У судзе Гомельскага раёна ў 14.30 судзяць журналістку-фрылансера **Ларысу Шчыракову** паводле артыкулу 23.34 КаАП («Удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве») у Рагачове. Ларысу судзіць старшыня суда Гомельскага раена **Кавалевіч.** Суддзя пастанавіла пакараць журналістку штрафам у памеры 7 базавых велічынь.



Пачынаюцца суды з акцыі салідарнасці каля ўваходу ў будынак. Каб падтрымаць калегаў, на суд прыехалі праваабаронцы "Вясны" **Алесь Бяляцкі і Валянцін Стэфановіч**. Сабралася каля 50-ці чалавек.

Першай разглядаецца справа **Андрэя Макарава**, якога вінавацяць у парушэнні ч.1 арт. 23.34 КаАП. Ён заявіў хадайніцтва, каб яго ў судзе прадстаўляў Леанід Судаленка. Суддзя **Осіпава** адхіляе хадайніцтва і выносіць прысуд - 25 базавых велічынь.

Ізноў жа суддзя Осіпава разглядае адміністрацыйную справу **Уладзіміра Кацоры.** Ён прызнае, што быў на акцыі і сказаў, што парушэнне ўжо прынятае незалежна ад складу суду. Пастанова - арышт на 12 сутак. Актывіста АГП **Мікалая Пяшко** суддзя Віктар Казачок пакаралі штрафам у памеры 25 базавых велічынь.

Суддзя Казачок разглядае справу **Анатоля Паплаўнага.** Хадайніцтва праваабаронцы аб далучэнні да матэрыялаў справы Зварота Абсерваторыі па абароне праваабаронцаў з нагоды судоў над Леанідам Судаленкам і Анатолем Паплаўным задаволілі, а хадайніцтвы аб тым, каб весці працэс па-беларуску, і прадстаўляць ягоныя інтарэсы ў судзе Леаніду Судаленку не прынялі. Пастанова - 10 сутак арышту.

Суддзя Андрэй Кармановіч пакараў **Андрэя Стрыжака** арыштам на 10 сутак завочна. Андрэй на суд не з'явіўся.

Блогеру **Зміцеру Сабураву** таксама вынеслі арышт на 10 сутак. Суддзя - Аляксандр Піскуноў.

Барысу Анікееву суддзя Сяргей Кармановіч прысудзіў штраф - 25 базавых велічынь.



У 17 гадзін пачынаецца разгляд адміністрацыйная справы па ч.1 арт. 23.34 КаАП праваабаронцы **Леаніда Судаленкі.** Суддзя Віктар Казачок выносіць самае нечаканае сёння рашэнне - абвясціць адміністрацыйнае папярэджанне.

Судзяць актывіста **Васіля Палякова.** Ён заявіў хадайніцтва аб прадстаўленні дзяжурнага (бясплатнага) адваката. Суддзя не дазваляе, кажа што не прадугледжана ПіКААП. Кажа, што грамадскі парадак не парушаўся, таму няма складу правапарушэння. Пастанова - штраф 1 базавая велічыня.

На 1 базавую велічычыню аштрафавалі таксама і актывіста **Юрыя Глушакова.**



За арыштаванымі прыехаў міліцэйскі аўтамабіль.



Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 921 "Нравится"
Нравится
Свяжитесь с нами



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Грамадзяніна Польшчы асудзілі ў Беларусі за "агентурную дзейнасць"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

